Назва ТВП: Простыр

© С. Левый

Код: BY037

Геаграфічныя каардынаты: 51° 56' N 26° 05' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Брэсцкая вобласць: Пінскі раён

Плошча: 10335 га

Крытэрыі: A1, B2, B3

Нацыянальны прыродаахоўны статус: ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Прастыр»

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП міжнароднай значнасці. Трансгранічная Рамсарская тэрыторыя «Стаход - Прыпяць - Простыр» з 2009 года.

Агульнае апісанне:

ТВП “Простыр” ўяўляе сабой апошні тыповы куток прыроды Цэнтральнага

Палесся, які захаваўся сярод пераўтвораных ландшафтаў. Уключае міжрэчча Прыпяці і Простыра, поймы рэк Гнілая Прыпяць і Стрыр. Гэтыя ўчастакі пойм палесскіх рэк ўяўляюць сабой чаргаванне забалочаных лугоў, адкрытых асаковых балот, лазняковых і трысняговых зараснікаў. Сярод гэтай суцэльна забалочанай прасторы раскіданы невялікія павышэнні (астравы) і цэлая сетка дробных азёр і старыц. Лясоў мала.

Тэрыторыя моцна абводнена, у выніку чаго нават у засушлівыя гады яна цяжкадаступная, а пры высокай вадзе і ўвогуле непраходная. На ўчастку, які прымыкае да ракі Прыпяць, размешчаны шматлікія старычныя азёры. Шырыня Прыпяці на тэрыторыі заказніка вар’іруе ад 15 да 40 м, Прастыра – ад 30 да 60.

Флора адносна не багатая. Адзначана 525 відаў вышэйшых сасудзістых раслін, большая частка з якіх з’яўляеца тыповымі гідра- і гіграфітамі.

Асноўныя віды землекарыстання ў заказніку – гэта сенакашэнне, выпас жывёлы, рэгламентаванае паляванне і аматарская рыбная лоўля, лесакарыстанне. Каля ТВП размешчаны восемь вёсак.

Асноўныя біятопы:

На тэрыторыі ТВП дамінуюць поймавыя лугі, трысняговыя і асаковыя балоты. У меншай ступені тут прадстаўлены хмызняковыя супольнасці і альховыя лясы.

Водна-балотныя ўгоддзі складаюць у цэлым каля 30% тэрыторыі, з іх нізінныя балоты складаюць 27%, вадаёмы - каля 1%, рэкі, пратокі і каналы - каля 2%.

Па левабярэжжы Простыры і па берагах Гнілой Прыпяці размешчана некалькі ўчасткаў чорнаальховых лясоў, якія складаюць каля 5% тэрыторыі.

Хмызнякі размешчаныя ў асноўным уздоўж рэк і каналаў, а таксама ў цэнтральнай частцы міжрэчча Прыпяць-Простыр. Разам яны займаюць каля 25% тэрыторыі ўгоддзя.

Лугавая расліннасць займае каля 40% ТВП. Дамінуюць вільготныя поймавыя супольнасці - каля 35%. Лугі на мінеральных астравах, складаюць каля 5%. Значныя плошчы заняты трысняговымі супольнасцямі.

Птушкі:

У складзе арнітафауны ТВППростыр адзначана 133 віда птушак. З іх гняздзіцца

або верагодня гняздзіцца 116 відаў. Адзначана 27 птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Найбольшае значэнне тэрыторыя ТВП мае для водна-балотных відаў. Тут гняздзяцца 4глабальна пагражаемыхі прыраўнаных да іх віда:вялікі арлец *Aquila clanga*, дубальт *Gallinago media*, вялікі грыцук *Limosa limosa*, вяртлявая чаротаўка *Acrocephalus paludicola*.

На тэрыторыі ўгоддзя гняздзіцца шэраг іншых птушак, якія маюць ахоўны статус у Еўропе або ў Беларусі. Сярод іх вялікая белая чапля *Egrettaalba* - у межах заказніка знаходзіцца мінімум дзве калоніі; салаўіны цвыркун *Locustella luscinioides* - дзякуючы наяўнасці значных плошчаў трысняговых зараснікаў, яго колькасць дастаткова высокая (650-1500 пар). Найбольшая шчыльнасць характэрна для поймы р. Гнілая Прыпяць - 62 ас. (спяваючых самцоў)/100 га. Малы пагоніч *Porzana parva* - агульная колькасць 315-530 пар, шчыльнасць віда найбольшая ў пойме р. Гнілая Прыпяць - 28 ас./100 га, у заказніку “Прастыр” - 2-3 ас./100 га. Звычайны пагоніч *Porzana porzana* - агульная колькасць 1500-4000 пар.

Іншыя групы жывел:

Дзякуючы цяжкай праходнасці тэрыторыі фактар неспакою ў пойме мінімальны, што спрыяе канцэнтрацыі ў заказніку розных відаў жывёл. Асабліва вялікае значэнне гэта тэрыторыя мае для лася *Alcesalces*, паколькі пойма служыць месцам летняга прыстанішча для самак з маладняком.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Чапля-бугай *Botaurus stellaris*	гн	25-40 с	2003-2006	Э		
Чапля-лазянік *Ixobrychus minutus*	гн	5-10 с	2003-2006	Э		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Чапля вялікая белая *Casmerodius albus*	гн	10-30 п	2003-2006	Д	↑	
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	3-5 п	2003-2006	Э		
Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla*	гн?	0-1 п	2007-2008	Д		
Арол-вужаед *Circaetus gallicus*	гн	2 п	2007-2008	Д		
Лунь палявы *Circus cyaneus*	мг	+	2003-2006	П		
Малы арлец *Aquila pomarina*	мг	+	2007-2008	П		
Арлец вялікі *Aquila clanga*	гн	3-4 п	2007-2010	Д	↔	A1
Скапа *Pandion haliaetus*	мг	+	2007-2008	П		
Сокал-пустальга *Falco tinnunculus*	мг	+	2007-2008	П		
Сокал-шуленак *Falco vespertinus*	гн?	0-1 п	2007-2008	Д		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Сокал-кабец *Falco subbuteo*	гн?	0-1 п	2007-2008	Д		
Пагоніч малы *Porzana parva*	гн	315-530 с	2003-2006	Э		B3
Пагоніч звычайны *Porzana porzana*	гн	1500-4000 с	2007	Э		B3
Драч *Crex crex*	гн	500-1100 с	2003-2006	Э		B2
Журавель шэры *Grus grus*	гн	11-22 п	2003-2006	Д		
Баталён *Philomachus pugnax*	гн	10-50 п	2003-2006	Э		
Дубальт *Gallinago media*	гн	20-40 с	2003-2006	Э		A1
Грыцук вялікі *Limosa limosa*	гн	10-20 п	2003-2006	Д		A1
Рыбачка белашчокая *Chlidonias hybrida*	гн	20-40 п	2003-2006	Д		
Пугач *Bubo bubo*	гн	+	2003-2006	Д		
Звычайны зімародак *Alcedo atthis*	гн	15-25 п	2003-2006	Э		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Жаўна зялёная *Picus viridis*	гн	1-3 п	2003-2006	Д		
Дзяцел беласпінны *Dendrocopos leucotos*	гн	5-10 п	2003-2006	Э		
Цвыркун салаўіны *Locustella luscinioides*	гн	650-1500 п	2003-2006	Э		В3
Чаротаўка вяртлявая *Acrocephalus paludicola*	гн	10-100 с	2003-2006	Д	↓	А1
Сініца белая *Cyanistes cyanus*	гн	50-200 п	2003-2006	Э		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Звяры: арэшнікавая соня *Muscardinusavellanarius.*

Рэптыліі: балотная чарапаха *Emysorbicularis.*

Рыбы: падуст *Chondrostomanasus.*

Насякомыя: залацістаямачны жужаль *Carabusclathratus,* рашэцісты жужаль *Carabuscancellatus,* прыгожы пядзенік *Chariaspilatesformosaria.*

Расліны: сальвінія плывучая *Salvinianatans*, берула прамая Berula*erecta*, крапіва кіеўская *Urticakioviensis*, пухірнік ягадны *Cucubalusbaccifer*, гарлачык белы *Nymphaeaalba,* касач сібірскі *Irissibirica*.

Пагрозы:

Парушэнне натуральнага воднага рэжыму водна-балотных экасістэм тэрыторыі.

Будоўля дамб у поймах рэк (Простыр, Гнілая Прыпяць, Стыр, Прыпяць) прыводзіць да рэзкіх ваганняў узроўня вады падчас паводкі.

Змененне накірунка і паскарэнне раслінных сукцэсій. З'яўляецца вынікам змены гідралагічнага рэжыму. У цэлым для тэрыторыі міжрэчча (Прыпяць-Простыр) характэрная накіраванасць сукцэсій у бок фарміравання перыядычна затапляемых лугавых экасістэм з наступным іх зарастанем хмызнякамі, а таксама трыснягова-хмызняковых экасістэм.

Пажары, некантралюемыя палы. У выпадку нізкага УГВ, адзначаемага штогод у ліпені-жніўні, падчас пажараў згарае не толькі раслінная біямаса, але таксама моцна пашкоджваецца паверхня глебы, што вядзе да яе дэградацыі.

Змена традыцыйнай гаспадарчай дзейнасці. Адсутнасць сенакосаў спрыяе зарастанню лугоў і балот дрэвамі, хмызнякамі і трыснягом

Узворванне земляў. Узворванне земляў на ўзнёслых участках (мінеральных астравах) каля пойм ажыццяўляецца ў наваколіцах вёсак Хойна і Востраў. Прыводзіць да змены месц гнездавання некаторых відаў птушак, у першую чаргу драча і кулікоў.

Вырубка леса. Нягледзячы на тое, што плошча лясоў невялікая, іх значэнне для шэрагу ахоўваемых відаў вельмі вялікае. Знішчэнне драўняна-хмызняковай расліннасці ўздоўж рэк і старыц прыводзіць да знікнення месц пражывання такіх відаў як чапля-лазянік, белая сініца і інш.

Вясновае паляванне і незаконнае паляванне адмоўна ўплывае на папуляцыі шматлікіх відаў птушак, у тым ліку рэдкіх і ахоўваемых. Любое паляванне ў вясновы перыяд з'яўляеца моцным фактарам непакою для усіх відаў птушак.

Наведванне лясных масіваў, мінеральных астравоў, а таксама выкарыстанне лодак з маторам у гнездавы перыяд аказвае некаторае адмоўнае ўздзеянне на гнездаваннептушак.

Выпас буйной рагатай жывёлы з павышанай шчыльнасцю на асобных тэрыторыях(з выкарыстаннем электра пастухоў) і так званае кашарнае утрыманне кароў у летні перыяд таксама адмоўна уздзейнічае на асобныя віды жівёл і

раслiннае покрыва.

Рэкамендацыі па захаванню:

Кіраванне гідралагічным рэжымам тэрыторыі.

Вызначэнне і вылучэнне водаахоўнай зоны для тэрыторыі ТВП, распрацоўка рэжыма выкарыстання вадааховай зоны. Забяспечэнне выканання ўсталяванага рэжыму гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі заказніка і вадаахоўнай зоны землекарыстальнікамі і мясцовымі жыхарамі.

Арганізаваць сістэму комплекснага маніторынгу тэрыторыі заказніка (гідралагічнага рэжыму, глеб, раслінных супольнасцяў, флоры, фауны і г.д.).

Неабходна таксама распрацоўка і правядзенне мерапрыемстваў па прадухіленні зарастання балот і лугоў хмызняком. У тым ліку патрэбна распрацаваць механізмы стымуляцыі мясцовага насельніцтва накіраваны направядзенні экалагічна-збалансаванага сенакашэння на тэрыторыі ТВП.

Важным з'яўляецца прадухіленне некантралюемых палаў, а таксама ўзмацненне кантролю за парушэннем прыродаахоўнага заканадаўства, звязанага з выпальваннем расліннасці як фізічнымі, так і юрыдычнымі асобамі, далучэнне мясцовага насельніцтва да кантроля за парушэннем прыродаахоўнага заканадаўства, звязанага з выпальваннем расліннасці.

Забарона веснавога палявання і прадухіленне незаконнага палявання на тэрыторыі заказніка.

Забарона выпасу буйной рагатай жывёлы з павышанай шчыльнасцю на асобных тэрыторыях (з выкарыстаннем электра пастухоў) і так званага кашарнага утрыманне кароў.

Прадухіленне знішчэння месцаў гнездавання рэдкіх відаў і перадача іх пад ахову.

Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Абрамчук А.В., Дамброўскі В.Ч., Левы С.В., Кіцель Д.

Абрамчук А.В. Орнитофауна Рамсарского угодья Простыр (Беларусь): состояние и угрозы// Збереження та відтворення ¦орізноманіття природно-

заповідних територій: матеріалі міжнародноі науково-практичноі конференæі, присвяченоі 10-річчю Рівненського природного заповідника, м. Сарни, 11-13 червня 2009 року – С. 335-344.

Домбровский В.Ч., Журавлев Д.В. Редкие виды хищных птиц на приграничных с Украиной особо охраняемых природных территориях Белорусского Полесья // Материалы 3 Международной конференции "Хищные птицы Украины". Кривой Рог, 25-26 октября 2008 г., с. 125-133.

Отчет по по НИР на тему«Проведение учётов индикаторных видов животных в заказниках «Споровский», «Званец», «Средняя Припять» и «Простырь». Науч. Руководитель Карлионова Н.В., Минск., 2010. – 56 с.

План управления республиканским ландшафтным заказником «Простырь» (разработан ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам», 2008 г.)

Положение о республиканском ландшафтном заказнике «Простырь» (утверждено Пост. Совета Министров Республики Беларусь от 28.02.1994 №115).

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. Простыр (Інфармацыю падрыхтавалі: Абрамчук А.В., Казулін А.В., Максіменкаў М.В., Скуратовіч А.М., Навіцкі Р.В.).

Складальнікі : Абрамчук А.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*